УДК 620.179.147

# ДАСЛЕДАВАННЕ ІМПУЛЬСНАГА МЕТАДУ У ВІХРАТОКАВАЙ ДЭФЕКТАСКАПІІ

**В. М. Лукашоў, С. М. Кухарэнка, Ю. В. Крышнёў**

*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны тэхнічны універсітэт імя П. В. Сухога», Рэспубліка Беларусь*

Любое прадпрыемства, якое выпускае прадукцыю з металу, вымушана ажыццяўляць праверку якасці вырабаў на адсутнасць у іх дэфектаў. У працэсе ўдасканалення сферы кантролю якасці былі засвоены розныя метады неразбуральнага кантролю (НК): акустычны, капілярны, магнітны, электрычны, радыяцыйны, цеплавы і г. д. [1]. Дадзенае даследаванне належыць да вобласці магнітнага неразбуральнага кантролю па прынцыпе віхратокавай дэфектаскапіі. У рабоце прыведзены дадзеныя даследаванняў імпульснага метаду пошуку дэфектаў у метале. Эксперыментальнае даследаванне імпульснага метаду дасць магчымасць вызначыць яго характарыстыкі і адчувальнасць. Пасля вынікі вымярэнняў дадуць магчымасць аналітычнай ацэнкі і выкарыстання прапанаванага метаду.

Праведзена эксперыментальнае даследаванне паслядоўнага LC-контуру (L = 12,56 Гн, C = 10 нф). Контур узбуджалі імпульсным сігналам (шырыня імпульсу $\tau$ = 100 мкс, перыяд сігналу $T$ = 40 мс). У полі контуру змяшчалі ўзор і асцылографам рэгістравалі параметры загасальнага пераходнага працэсу ($t_1$, $t_2$ – значэнні моманту часу першага і другога максімуму адпаведна; $U_1$, $U_2$ – амплітуда першага і другога максімуму адпаведна, $\delta = \frac{1}{t_2 - t_1}\ln\left(\frac{U_1}{U_2}\right)$ – каэфіцыент згасання пераходнага працэсу). Вымярэнне было выканана для чатырох узораў з рознымі дыяметрамі адтулін. Вынікі вымярэнняў прыведзены ў табліцы.

**Вынікі эксперыментальга даследавання**

| Параметры пераходнага працэсу | Дыяметр адтуліны ва ўзоры *d* | | | |
|---|---|---|---|---|
| | – | 3 мм | 4 мм | 10 мм |
| $t_1$, мкс | 600 | 590 | 590 | 570 |
| $U_1$, В | 2,8 | 2,78 | 2,8 | 2,8 |
| $t_2$, мкс | 2900 | 2870 | 2900 | 2850 |
| $U_2$, В | 1,8 | 1,7 | 1,75 | 1,8 |
| $\delta$, $c^{-1}$ | 192,1 | 215,7 | 203,5 | 193,8 |

Па выніках праведзеных даследаванняў можна зрабіць наступныя высновы:

1. Залежнасць каэфіцыента згасання ад дыяметра дэфекту $\delta(d)$ нелінейная.
2. Прапанаваны метад дэфектаскапіі можа быць рэалізаваны на аснове фармальнай матэматычнай мадэлі (эмпірычнай залежнасці $\delta(d)$, знятай для канкрэтных узораў з улікам іх формы і матэрыялу).
3. Выкарыстанне ў якасці віхратокавага пераўтваральніка рэзананснага паслядоўнага RLC-контуру павысіць перашкодаабароненасць прылады і забяспечыць патрабаваныя характарыстыкі дэфектаскопа.

Л і т а р а т у р а

1. Герасимов, В. Г. Неразрушающий контроль качества изделий / В. Г. Герасимов [и др.]. – М. : Энергия, 1978. – 216 с.